РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Хадзінская Н.М.,** *ст. выкладчык*

# АСАБЛІВАСЦІ СТЫЛЮ ТВОРЧАСЦІ ДЗ.СМОЛЬСКАГА Ў 80-Я ГАДЫ

Значнае месца ў беларускай музыцы 80-х гадоў займае творчасць тых кампазітараў сярэдняга пакалення, якія пачалі свой творчы шлях у другой палове 60-х гадоў. Кампазітары, аб якіх пойдзе гаворка, ужо знаходзяцца ў пары творчай сталасці.

Іх імёны вядомы за межамі Беларусі. Гэта І.Лучанок, Дз.Смольскі, С.Картэс, Р.Сурус, А.Мдзівані, К.Цесакоў, Ф.Пыталеў і інш. Кожны з іх, паспрабаваўшы свае сілы ў самых разнастайных жанравых сферах, вызначыў для сябе асноўную, вядучую. Так, І.Лучанок і Э.Ханок - кампазітары-песеннікі; С.Картэс і Р.Сурус аддаюць перавагу жанрам, у якіх пануе слова (оперы, араторыі, музычнай камедыі, вакальна-сімфанічнай паэме); Ф.Пыталеў піша ў асноўным сімфоніі; для А.Мдзівані аблюбаванай з'яўляецца галіна харавой музыкі; для К.Цесакова - квартэт; для Дз.Смольскага 80-я гады прайшлі «пад знакам» сімфоніі.

У 80-я гады вызначыліся характэрныя рысы шэрага кампазітарскіх стыляў. Музыка С.Картэса распазнаецца па яркай тэатральнасці, маляўнічай аркестроўцы, шматслойнай фактуры, буйному штрыху. Почырк А.Мдзівані вылучае «мазаічнасць» тэматызму, бляск і вытанчанасць «фальклорных» твораў, цікавасць да славянскай архаікі. Стыль К.Цесакова - гэта напружанасць і дысанантнасць музычнай тканіны, экспрэсія нагнятанняў і экзальтаванасць кульмінацый. Дэталёвая распрацоўка матэрыялу, кампактнасць і эканомнасць выказвання - прыметы стылю Дз.Смольскага.

Усе гэтыя разнастайныя стылі маюць і некаторыя агульныя рысы, у прыватнасці ў адносінах да меладычнага пачатку. Працяглыя выразныя мелодыі ўступаюць месца тэматызму напевачнага характару (А.Мдзівані), рэчытатыўнаму меласу (К.Цесакоў, С.Картэс), тэматычнаму «мінімалізму» (Дз.Смольскі). Аб'ядноўвае кампазітараў і перавага храматычнай інтанацыйнасці, якая грунтуецца на пашыранай танальнасці.

Сярод кампазітараў свайго пакалення Дз.Смольскі вылучаецца як стваральнік стылю, глыбіня і значнасць тэматыкі якога, своеасаблівасць стылістычных рыс надаюць яму індывідуальны, непаўторны характар. У творчасці Смольскага вылучаюцца тры перыяды - 60-я, 70-я і 80-я гады са сваімі «прыярытэтнымі» жанравымі і вобразнымі сферамі. У 80-я гады Смольскі стварае пяць сімфоній - з Другой па Шостую. На змястоўным узроўні назіраецца раскрыццё лірыка-псіхалагічных і драматычных, нават трагедыйных вобразаў, сутыкненне



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кантрастных полюсаў - асабістага (духоўнага) і абыякава-варожага пачаткаў.

У выніку аналізу трох комплексаў выразных сродкаў у творах 80-х гадоў - гукавышыннага, часавага і тэмбравага - можна зрабіць наступныя вывады. Гукавышынны параметр пранізаны монаінтанацыйнасцю (секундавай). Вертыкальны аспект характарызуецца поліструктурнасцю як на ўзроўні акордыкі, так і на ўзроўні танальнасці і гукавышыннай сістэмы наогул. У арганізацыі часавых адносін звяртае на сябе ўвагу даволі традыцыйны падыход да метрарытмічнага параметра. Асноўным арганізуючым прынцыпам з'яўляецца квадратная перыядычнасць. У пабудове цэлага кампазітар развівае свой тып цыкла - трох-(адна-) часткавы з фіналам (рэпрызай). Аркестроўка - адзін з найбольш важных сродкаў драматургіі твораў Смольскага. Кампазітар звяртаецца да невялікага складу інструментаў. У гэтым знаходзіць праяву ўласцівы кампазітару прынцып «эканоміі сродкаў». Празрыстасць аркестравай фактуры, значная ўвага да дэталей, тэмбравая мазаічнасць характэрны для аркестравага пісьма кампазітара ў 80-я гады.

Творчасць Смольскага адыграла і працягвае адыгрываць вельмі важную ролю ў развіцці беларускай кампазітарскай традыцыі. Яна дала штуршок да пошукаў новых сродкаў выразнасці (серыйнасці, алеаторыкі, полістылістыкі). Не менш важны для беларускага мастацтва і псіхалагічны, духоўны аспект музыкі Смольскага, якая не здзіўляе знешнім бляскам і шчодрай маляўнічасцю, але прымушае да разважанняў аб чалавечай сутнасці, вечных праблемах быцця.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ